Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

3 КРАСАВІКА 2018 г. АЎТОРАК № 63 (28679)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Пра зборы – з першых вуснаў**

СТАР. 4



**Крыптавалюты – як гэта працуе**



**Трагедыя адзінокай пенсіянеркі**

СТАР. 13

# ДЫНАМІКА «ДЫНАМА»



**Будаўнікі спяшаюцца завяршыць рэканструкцыю сталічнага стадыёна «Дынама», які стане адной з галоўных арэн II Еўрапейскіх гульняў. Зараз яны манціруюць навес над заходняй трыбунай спартыўнай арэны.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Заканадаўчае забеспячэнне перспектыўнага развіцця краіны

*Выступленне старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь М. У. МЯСНІКОВІЧА на адкрыцці чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання*

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Паважаныя запрошаныя!



Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкам у IV квартале 2017 г. і ўжо сёлета прыняты шэраг сістэмных рашэнняў, накіраваных на ўдасканаленне сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржавы на сучасным этапе, над выкананнем якіх працуюць дзяржорганы і арганізацыі нашай краіны. Гаворка ў першую чаргу ідзе пра пакет дэкрэтаў, у якіх замацаваны канкрэтныя меры ў сферы прадпрымальніцтва, занятасці, лічбавай эканомікі.

Кіраўніком дзяржавы вызначаны і колькасны арыенцір развіцця — дасягненне да канца наступнай пяцігодкі ВУП у аб'ёме 100 млрд долараў ЗША, гэта значыць, па сутнасці, падваенне гэтага паказчыка за найбліжэйшыя 8 гадоў. Каб выйсці на такі ўзровень развіцця, тэмпы росту нацыянальнай эканомікі ў гэты перыяд павінны перавышаць сярэднесусветныя.

Гэта стратэгічная комплексная задача не толькі ўрада, але і парламента, усіх без выключэння дзяржаўных органаў, усёй кіраўніцкай вертыкалі.

У лютым 2018 года прайшла значная агульнадзяржаўная палітычная падзея — выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў. Дэпутатамі абрана больш за 18 тысяч чалавек — гэта сур'ёзны рэсурс для вырашэння актуальных пытанняў развіцця рэгіёнаў і краіны ў цэлым.

СТАР. 3

## Галоўны арыенцір — новыя крыніцы ўстойлівага росту

*Выступленне старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. П. АНДРЭЙЧАНКІ на адкрыцці чацвёртай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання*

Паважаныя дэпутаты, члены ўрада і запрошаныя!



Пачынае работу чацвёртая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання.

Бягучы год — ключавы ў рэалізацыі Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады. Пераход да Індустрыі 4.0, вызначэнне новых крыніц росту, заахвочванне дзелавой ініцыятывы грамадзян не проста патрабаванне часу. Гэта шлях развіцця сусветнай эканомікі. Ад вырашэння задач, акрэсленых у Праграме, залежаць непасрэдна канкурэнтаздольнасць краіны, грамадская стабільнасць і рост дабрабыту насельніцтва.

Рашэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, накіраваныя на развіццё прадпрымальніцтва і лічбавых тэхналогій, патрабуюць перагляду дзейнага заканадаўства, змянення падыходаў да рэалізацыі бюджэтна-падатковай палітыкі, інвестыцыйнай дзейнасці, дыверсіфікацыі экспарту, мадэрнізацыі галін эканомікі.

Усе гэтыя задачы, а таксама ўстаноўкі, якія кіраўнік дзяржавы адрасуе дэпутацкаму корпусу ў яго Пасланні беларускаму народу і парламенту, будуць у цэнтры ўвагі будучай сесіі.

Ужо сёння ў парламенцкім партфелі каля 50 пытанняў, большая частка з якіх нацэлена на развіццё эканомікі.

СТАР. 3

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Міхаіл ПАРТНОЙ, намеснік міністра спорту і турызму:**

*«На дзвюх турыстычных дэстынацыях ужо дзейнічае 10-дзённы бязвізавы рэжым. Па Нацыянальным аэрапорце Мінск таксама актыўна ідзе працэс па павелічэнні працягласці знаходжання. Упэўнены, што да канца года будзе прынята станоўчае рашэнне на гэты конт. На бяспеку бязвізавы рэжым не ўплывае, затое ён станоўча адбіваецца на эканоміцы, палітычным іміджы краіны».*

ISSN 1990 - 763X